Источник: **«Звязда» - 2012-04-19**

## Замкнёнасць — не на карысць літаратуры

Учора ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі адкрылася Міжнародная навуковая канферэнцыя «Беларуская і руская літаратуры: тыпалогія ўзаемасувязяў і нацыянальнай ідэнтыфікацыі».

Аляксандр Лукашанец, дырэктар Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы, член-карэспандэнт НАН Беларусі, адзначыў, што наша дзяржава ўдзяляе вялікую ўвагу духоўнаму развіццю грамадства, невыпадкова за сучаснымі інфармацыйнымі тэхналогіямі мы не страцілі кнігу. І сімвалічна, што надзвычай важныя для духоўнага жыцця грамадства тэмы, актуальныя навуковыя праблемы абмяркоўваюцца менавіта ў Акадэміі навук — інтэлектуальным цэнтры краіны.

Стасункі паміж літаратурамі павінны ўзмацняцца, бо адасобленасць, камернасць, замкнёнасць ніколі не былі на карысць літаратуры і мовы, падкрэсліў акадэмік НАН Беларусі Уладзімір Гніламёдаў. «Беларуская літаратура — адна з самых гуманных літаратур свету. Так наканавана лёсам», — упэўнены галоўны рэдактар часопіса «Полымя» Мікола Мятліцкі.

Асаблівасці беларуска-рускіх літаратурных сувязяў у розныя гістарычныя перыяды, праблемы гарманічнага суіснавання рускай культуры з нацыянальнай, філасофія бачання свету ў творчасці класікаў і сучаснікаў, праблемы перакладу і многія іншыя абмяркоўваюцца на канферэнцыі, у якой бяруць удзел не толькі айчынныя навукоўцы, але і вучоныя з Расіі і Польшчы.

**Таццяна ВІЧЫК**